

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 21 (145)    25 верасня 1990 года


# СПЕЦВЫПУСК «АБІТУРЫЕНТ»

## Факультэт Давузаўскай Падрыхтоўкі — гэта:

— ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ, МЭТАНАКІРАВАНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЭКЗАМЕНАЎ У ВНУ.

— МАГЧЫМАСЦЬ ЗДАЦЬ ДВА ВЫНІКОВЫЯ ЭКЗАМЕНЫ НА ФДП, А КАЛІ ВЫ АТРЫМАЛІ «ПЯЦЬ» — ГЭТАЯ АДЗНАКА І БУДЗЕ Ў ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫМ ЛІСЦЕ НА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ ВА УНІВЕРСІТЭТ.

ТАКІМ ЧЫНАМ ФДП — ЗНАЧНЫ ШАНС НА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ!

Мэта, якую ставіць ФДП:

— ПАДРЫХТАВАЦЬ ВАС ДА ПАСТУПЛЕННЯ ВА УНІВЕРСІТЭТ, А ТАКСАМА Ў ІНШЫЯ ВНУ КРАІНЫ, іншымі словамі кажучы — сістэматызаваць тыя веды, якія вы атрымалі ў агульнаадукацыйнай школе, навучыць правільна, дакладна выказваць свае думкі, паспяхова рашаць самыя разнастайныя задачы ўступных экзаменаў.

Заняткі будуць праводзіцца на аддзяленнях:

МАТЭМАТЫКІ, ФІЗІКІ, БІЯЛОГІІ, ХІМІІ, РУСКАЙ МОВЫ, БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ,РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ, НЯМЕЦКАЙ МОВЫ, ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВА, МУЗЫКІ,ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА.

Працаваць са слухачамі ФДП будуць вопытныя высокакваліфікаваныя спецыялісты ГрДзУ, зацікаўленыя ў тым, каб у канчатковым выніку універсітэт атрымаў менавіта СВАЙГО АБІТУРЫЕНТА, які мае пэўную базу неабходных ведаў, гатовы да напружанай працы на шляху да прафесіі.

Тых, хто прыйдзе на ФДП, чакаюць сістэматычныя заняткі, кансультацыі, пастаянны творчы кантакт з выкладчыкамі. Будуць кантрольныя работы, сесіі ў завочнікаў.

У працэсе навучання таксама—камп ʼютэрная дыягностыка прафпрыгоднасці, псіхалагічнае тэстыраванне і г. д.

Ёсць у ФДП перспектывы. У будучым годзе, магчыма, слухачамі факультэта стануць не толькі выпускнікі сярэдніх школ, а таксама вучні 9—10 класаў. ФДП, дарэчы, плануе ў будучым прапаноўваць свае паслугі і тым, хто думае паступаць на завочнае аддзяленне універсітэта.

Зазначым, што кожны чацвёрты абітурыент сёлетняга набору ва ўніверсітэт, які паступіў сюды на вучобу—выпускнік ФДП.

Паступіць на ФДП вы зможаце, калі ЎВАЖЛІВА ПАЗНАЁМІЦЕСЯ З ПРАВІЛАМІ ПАСТУПЛЕННЯ І ПРАВІЛЬНА ВЫКАНАЕЦЕ ЎСЕ ЗАЗНАЧАНЫЯ ТАМ ПАТРАБАВАННІ. Набор у школу не абмежаваны.

Спяшайцеся выкарыстаць магчымы шанс!



### У НУМАРЫ:


*ДАВАЙЦЕ ЗНАЁМІЦЦА*

*ПАРАДЫ АБІТУРЫЕНТАМ*

*ПРАВІЛЫ ПАСТУПЛЕННЯ НА ФДП*


## Парады абітурыенту

**Парада першая.** Сур ʼёзна падумайце аб с будучыні. Выбар прафесіі — учынак выключнай насці, ён у многім вызначыць усё ваша далей жыццё. Паспрабуйце не памыліцца.

**Парада другая.** Вырашыце, у якую навучаль установу будзеце паступаць і вызначыце, да экзаме па якіх прадметах вам неабходна рыхтавацца.

**Парада трэцяя.** Рыхтавацца да ўступных экзам трэба мэтанакіравана, з улікам патрабаванняў той В куды вы збіраецеся паступаць. Веданне матэма ўвогуле, фізікі ўвогуле і г. д. яшчэ не гара паспяховай здачы экзаменаў.

**Парада чацвёртая.** Калі Вы вырашылі пасту у ВНУ, жадаеце атрымаць дапамогу ў падрыхтоўц ўступных экзаменаў, сістэматызаваць веды, атрыма ў агульнаадукацыйнай школе, мець магчымасць па янна параўноўваць свае веды з узроўнем патрабаван уступных экзаменаў, а таксама атрымаць індывіду ныя кансультацыі, паступайце на ФДП — факул давузаўскай падрыхтоўкі.

**Парада пятая.** Дзень здачы экзамена — надзвы нялёгкі і напружаны, гэта так званы пік вац інтэлектуальнага і фізічнага стану. Таму непасрэ перад экзаменам неабходна добра адпачыць.

**Парада шостая.** У час вуснага экзамена добра б б прытрымлівацца некалькіх простых правіл:

1) уважліва выслухайце пытанне, калі ж не зразум яго, перапытайце экзаменатара;

2) будзьце ветлівымі і добразычлівымі, ні ў я разе не ўступайце ў канфлікт з выкладчыкам — г можа прывесці да непрадказальнага;

3) нават калі пытанне здаецца зусім простым, с задача, якую прапанаваў экзаменатар, знаёмая вам, спяшайцеся адказваць адразу, абавязкова падумайц добра аформіце адказ або рашэнне.

**Парада сёмая.** Нарэшце, памятайце, што ніхто ле вас не ведае вашых жаданняў, мэт і магчымасцей, та разлічвайце ў асноўным на свае сілы і пастарайцес складаных сітуацыях не губляць пачуцця гумару.

### *З УСМЕШКАЙ*



— Ах, Грыбаедаў, хлябнеце вы гора са сваім розум

## ДЛЯ ПАСТУПЛЕННЯ НА ФДП НЕАБХОДНА:

**пераканацца ў сваім цвёрдым рашэнні паспяхова займацца на ФДП;**
**— правільна аформіць заяву;**
**— аплаціць навучанне і своечасова даслаць дакументы на адрас ФДП.**

## ФАКУЛЬТЭТ ЧАКАЕ

вучняў выпускных класаў сярэдніх школ і іншых сярэдніх навучальных устаноў, асоб, якія працуюць у народнай гаспадарцы і жадаюць паступіць на вучобу ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы або ў іншыя ВНУ краіны.

## АДДЗЯЛЕННІ ФДП

**Заняткі будуць праводзіцца на наступных аддзяленнях:**
**матэматыкі,**
**фізікі,**
**біялогіі,**
**хіміі,**
**рускай мовы,**
**беларускай мовы,**
**англійскай мовы,**
**нямецкай мовы,**
**гісторыі і грамадазнаўства,**
**музыкі,**
**выяўленчага мастацтва.**

**Навучанне на аддзяленнях замежных моў, музыкі і выяўленчага мастацтва — толькі па вочнай форме, на астатніх—па вочна-завочнай.**

## ШТО НА ФІНІШЫ?

**Тыя ж навучэнцы са слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, хто паспяхова скончыць курс навучання, атрымаюць пасведчанне аб заканчэнні пэўнага аддзялення ФДП з рэкамендацыяй для паступлення ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы.**

**Слухачам даецца права здаваць выніковыя экзамены не больш, чым па двух прадметах, прычым адзін з іх — профільны. У выніку атрымання на гэтых экзаменах адзнакі «выдатна» обо атрымання дыпломаў 1—3 ступені на абласных прадметных алімпіядах, якія будуць праводзіцца на факультэце упраўленнем народнай адукацыі, слухачы ФДП вызваляюцца ад здачы ўступнага экзамена ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце па гэтых прадметах з выстаўленнем ім адзнакі «5».**

**Выпускныя экзамены на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі будуць праводзіцца ў другой палове мая 1991 года, алімпіяды—у красавіку 1991 года.**

## *Усміхнемся разам*

*З сачыненняў*

**Чернышевский считал, что все передовые революционеры должны быть эгоистами, потому что они разумные люди, но мы не можем с этим целиком согласиться.**

***

**Татьяна Ларина была довольно нескромной особой: она первая призналась в любви Онегину, а этого не должна делать ни одна современная девушка, не говоря уже о женщинах.**

***

**Величие нашей эпохи заключается в том, что мы занимаемся мелкими делами, которые потом становятся великими.**

***

**Основными произведениями Фадеева являются «Разгром», «Молодая гвардия», и «Последний из Улан-Уде».**

***

**В древнерусском языке были носовые звуки. Потом их обменял на редуцированные какой-то князь, а с кем обменял, я не помню.**

***

**Реформу азбуки начал царь Петр Первый, а завершила Октябрьская революция, а после нее—советские ученые**

***

**Предложение может быть многозначным, например, в грамматике или девушке, которая еще не была замужем ни разу.**

***

**Печорин убил Грушницкого из пистолета, в котором не было пули, хотя потом ее туда положили.**

***

**Чернышевский построил свою теорию о будущем России на снах Веры Павловны.**

# ПРАВІЛЫ ПАСТУПЛЕННЯ НА ФАКУЛЬТЭТ ДАВУЗАЎСКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ Ў 1990/91 НАВ. Г.

## *Як пісаць заяву*

**Такім чынам, каб стаць навучэнцам ФДП, неабходна падаць (або даслаць) заяву на імя рэктара універсітэта, у якой указаць абраныя аддзяленні, пэўныя прадметы, якія будзеце вывучаць; сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, хатні адрас з указаннем паштовага індэксу, звестак з месца работы або вучобы. Дарэчы, да заявы неабходна прыкласці квітанцыю аб пераводзе грошай на адрас ФДП (аплата асобна па кожнаму прадмету, а на квітанцыі абавязкова зазначце, навучанне па якому прадмету аплачваецца).**

**Прыём заяў пачаўся 3 верасня і будзе скончаны 1 кастрычніка. Час прыёму дакументаў на ўсе аддзяленні— з 10 да 18 гадзін (акрамя суботы і нядзелі).**

**Адрас, на які неабходна дасылаць заявы:**

**230023 г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, галоўны вучэбны корпус, пакой 209, ФДП, тэлефон для даведак — 47-14-58.**



## *Заняткі не за гарамі*

Так, не за гарамі, таму што пачнуцца заняткі на факультэце **з 10 кастрычніка гэтага года.** Тыя, хто вырашыць займацца вочна, будуць наведваць універсітэт 1—2 разы ў тыдзень у вячэрні час і ў нядзелю.

Слухачы ж завочнай формы навучання кантрольныя заданні будуць атрымліваць па пошце **з другой паловы кастрычніка.** У перыяд зімовых і веснавых канікул, а іншы раз і ў нядзелю, яны будуць запрашацца на так званыя аднадзённыя вучэбныя сесіі.

Адзначым таксама,што заняткі на аддзяленнях ФДП будуць праводзіць вопытныя выкладчыкі універсітэта, прымяняючы новыя формы і метады навучання. Змест лекцый, практычных і лабараторных заняткаў будзе адпавядаць асноўным пытанням праграм для паступаючых у ВНУ. Вучэбныя планы заняткаў прадугледжваюць правядзенне кантрольных работ, прадметных алімпіяд, а таксама індывідуальных кансультацый.

## *Плата за навучанне*

Факультэт працуе на аснове самаакупнасці. Кошт за ўвесь перыяд навучання па аднаму прадмету складае:

**вочная форма навучання:**

на аддзяленнях матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, рускай мовы, беларускай мовы, рускай літаратуры, беларускай літаратуры, гісторыі і грамадазнаўства — 100 рублёў, на аддзяленнях музыкі, выяўленчага мастацтва, англійскай, нямецкай мовы—125 рублёў;

**завочная форма навучання:** на ўсіх аддзяленнях 50 рублёў.

Грошы за навучанне дасылаць паштовым пераводам па адрасу: **г. Гродна, ОПУ Жылсацбанка, разліковы рахунак № 141703, дзяржуніверсітэт, ФДП (абавязкова ўказаць аддзяленне).**

**Заўвага:** асобам, якія спынілі датэрмінова вучобу на ФДП, выплачаная грашовая сума не вяртаецца.

## Карысная інфармацыя

У адпаведнасці з рашэннем прыёмнай камісіі абітурыенты, якія будуць паступаць ва універсітэт у 1991 годзе на дзённае навучанне, будуць здаваць наступныя экзамены:

**По спецыяльнасцях, спецыялізацыях і дадатковых напрамках падрыхтоўкі:**

**фізіка, радыёфізіка і электроніка, аптычныя прыборы і сістэмы:** профільныя — фізіка (пісьмова), матэматыка (пісьмова) і няпрофільныя—беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка** (усе спецыяльнасці, акрамя вытворчай): профільныя — матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка:** спецыялізацыя — матэматычнае забеспячэнне ГАП, САПР, АСУ: профільныя — матэматыка (пісьмова), фізіка (вусна) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**біялогія, дадатковыя напрамкі падрыхтоўкі — хімія, практычная псіхалогія:** профільныя— біялогія (пісьмова), хімія (вусна) і няпрофільныя—беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**біялогія, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — геаграфія:** профільныя — біялогія (пісьмова), геаграфія (вусна) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**гісторыя, дадатковыя напрамкі падрыхтоўкі — англійская мова, нямецкая мова:** профільныя — гісторыя СССР (пісьмова), замежная мова (па выбару абітурыента) (вусна), беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**правазнаўства:** профільныя — гісторыя СССР (пісьмова), грамадазнаўства (вусна), беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**беларуская мова і літаратура; польская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура:** профільныя—беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова (вусна), беларуская літаратура (вусна) і няпрофільны — руская мова і літаратура (вусна);

**руская мова і літаратура; польская мова і літаратура і руская мова і літаратура:** профільныя — руская мова (дыктоўка), руская мова (вусна), руская літаратура (вусна) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — музыка:** профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), музыка і няпрофільны—руская мова (дыктоўка);

**Педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі—выяўленчае мастацтва:** профільныя— беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), малюнак і няпрофільны—руская мова (дыктоўка);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі** — методыка выхаваўчай работы: профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), гісторыя СССР (вусна) і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**фізічная культура:** профільныя — біялогія (вусна), лёгкая атлетыка, гімнастыка і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна).

Узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя вучэбныя установы або сярэднія прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы з дыпломам з адзнакай, пры паступленні на дзённае аддзяленне ў залежнасці ад спецыяльнасці здаюць адзін наступны экзамен: **фізіка, радыёфізіка і электроніка, аптычныя прыборы і сістэмы** — фізіка (пісьмова); **матэматыка** — матэматыка (пісьмова); **біялогія—біялогія (пісьмова), фізічная культура** — біялогія (вусна); **гісторыя, правазнаўства** — гісторыя СССР (пісьмова); **руская мова і літаратура, польская мова і літаратура і руская мова і літаратура** — руская мова (дыктоўка);**беларуская мова, польская мова,польская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура** — беларуская мова (дыктоўка); **педагогіка і методыка пачатковага навучання** — беларуская мова і літаратура (сачыненне).

Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад здачы астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнак «чатыры» або «тры» здаюць астатнія экзамены.

На абітурыентаў, якія скончылі з дыпломам з адзнакай сярэднія прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы на базе сярэдняй адукацыі, указаны парадак распаўсюджваецца пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманым прафесіям.

Паважаныя сябры! Будзем рады вітаць вас на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі!

## *Вялікія за партай*

**— Зноў замест урока заалогіі вы, Крылоў, расказваеце нам нейкія басні!**



✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦



**— Калумб, дзе Вы шукаеце Індыю?**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 5157

Тыраж 3000 экз.

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.